View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# КОЛЬКАСНЫ РОСТ НАСЕЛЬНІЦТВА ГАРАДОЎ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX СТ.

Рост насельніцтва гарадоў, складанне сацыяльных груп, якія з’явіліся асновай фарміравання класаў капіталістычнага грамадства, неаднаразова адзначаліся даследчыкамі як тэндэнцыя развіцця новых, капіталістычных адносін [1]. Рост гарадскога насельніцтва сведчыць аб глыбіні і інтэнсіўнасці працэсу грамадскага раздзялення працы. Павелічэнне гарадскога насельніцтва ў Еўрапейскай Расіі з’яўляецца найбольш агульнавядомай прыкметай капіталістычнага развіцця краіны, “хаця ён адлюстроўвае з’яву далёка не дастаткова, не ахоплівае важных асаблівасцей Расіі параўнальна з Заходняй Еўропай” [2]. Можна назваць некаторыя з гэтых асаблівасцей: адсутнасць свабоды перамяшчэння сялян, існаванне прамысловых і фабрычных пасяленняў, унутраная каланізацыя. Гэтыя рысы, дапоўненыя некаторымі спецыфічнымі фактарамі (насільнае ссяленне яўрэйскага насельніцтва з сельскай мясцовасці ў гарады і мястэчкі, наяўнасць вялікай колькасці войскаў у гарадах заходніх губерняў, дэкласаванне дробнай шляхты і інш.), характэрны былі і для беларускіх губерняў.

Кожнаму асобнаму гістарычнаму спосабу вытворчасці ўласцівы свой асаблівы, які мае гістарычнае значэнне, закон народанасельніцтва [3]. У канкрэтных гістарычных умовах змяненне колькасці і саставу насельніцтва можа істотным чынам уплываць на эканоміку той або іншай краіны. У.І. Ленін пісаў: “Умовы размнажэння ... залежаць ад будовы розных сацыяльных арганізмаў, і таму закон народанасельніцтва патрэбна вывучаць для кожнага такога арганізма асобна, а не “абстрактна”, без адносін да гістарычна розных форм грамадскай будовы” [4].

Перыяд разлажэння феадалізму і зараджэння капіталістычных адносін ва ўсіх краінах характарызаваўся ростам гандлёва-прамысловага насельніцтва, сканцэнтраванага галоўным чынам у гарадах і мястэчках. “...Нельга сабе ўявіць капіталізму без павелічэння гандлёва-прамысловага насельніцтва за кошт сельскага, і кожны ведае, што гэта з’ява самым рэльефным чынам выяўляецца ва ўсіх капіталістычных краінах” [5]. Па тэмпах росту гарадскога насельніцтва Беларусь займала адно з першых месц у Расійскай імперыі. Напрыклад, у другой палове XVIII ст. у беларускіх губернях насельніцтва гарадоў і мястэчак складала 14% ад усяго насельніцтва [6]. З 1786 па 1861 г. насельніцтва 42 гарадоў беларускіх губерняў павялічылася з 80 тыс. чалавек, г. зн. у 4 разы. Інакш кажучы, тэмпы росту колькасці гарадскога насельніцтва ў разглядаемы перыяд былі высокія, асабліва ў параўнанні з ростам насельніцтва Беларусі, агульная колькасць якога за гэты ж час узрасла толькі на 36% [7].

Рост колькасці гараджан праходзіў на працягу ўсяго перыяду, за выключэннем некалькіх гадоў пасля вайны 1812 г. Ніжэй тэмпы яго росту назіраліся ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. Так, прырост гарадскога насельніцтва з 1796 па 1803 г. склаў не больш чым 3%, што можна растлумачыць недакладнасцю рэвізскага ўліку. З 1803 па 1811 г. гарадское насельніцтва Беларусі вырасла на 27%.

Праводзячы перапіс насельніцтва пасля вайны 1812 г., царскія чыноўнікі ў лік выбыўшых уносілі памерлых, забітых, узятых у рэкруты, забраных ворагам і “ўцёкшых невядома куды” [8]. Вялікае скарачэнне насельніцтва адбылося таксама ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выніку эпідэміі халеры і іншых захворванняў, смерці ад голаду і нястачы. Таму за перыяд з 1811 па 1815 г. колькасць гарадскога насельніцтва падае: на 43% скарацілася колькасць гараджан толькі Віцебскай губерні: калі ў 1811 г. яно складала 30554, то ў 1813 г. – 17400 чалавек. Асабліва рэзка скарацілася колькасць насельніцтва Віцебска, Полацка, Гарадка, Дрысы, Лепеля і Суража [9]. Напрыклад, толькі ў Віцебску за тры месяцы 1812 г. загінула 2415 чал. – больш за 30% жыхароў, якія пражывалі ў горадзе [10]. У Полацку ў 1811 г. налічвалася 6848 чалавек, а ў 1813 г. – 5392; у наступныя гады ад голаду і эпідэмій памерла яшчэ 2052 чалавекі, у 1817 г. тут пражывала ўсяго 3340 чалавек абодвух полаў [11]. Частка жыхароў, што пакінулі гарады ў час ваенных дзеянняў, затым зноў вярнулася назад. Так, калі ў 1811 г. у Мінску было 11205 чалавек, то ў канцы 1812 г. налічвалася ўсяго 3480 [12] (частка жыхароў пакінула горад і пераехала ў іншыя губерні Расіі, частка пайшла ў сельскую мясцовасць); пасля вайны большая частка жыхароў вярнулася ў горад, і ў 1815 г. у Мінску пражывала 8555 чалавек [13]. Моцна пацярпелі ў час вайны Кобрын, Ваўкавыск, Пружаны [14], у 1811 г. у Пружанах налічвалася 536 чалавек мяшчан-хрысціян мужчынскага полу, а ў 1815 г. – 202 [15], у Ваўкавыску колькасць гэтай катэгорыі гарадскіх жыхароў скарацілася на 174 чалавекі [16]. Зменшылася колькасць насельніцтва і астатніх гарадоў Гродзенскай губерні [17]. Менш за ўсё пацярпелі гарады Магілёўскай губерні; тут назіраўся нават некаторы рост гарадскога насельніцтва (з 1814 па 1815 г. – на 270 чалавек па ўсіх гарадах губерні), хаця агульная колькасць насельніцтва губерні за гэты перыяд скарацілася на 71917 чалавек [18]. У цэлым па ўсіх губернях Беларусі колькасць гарадскога насельніцтва за ваенны перыяд і пасляваенныя гады (1813 – 1815) скарацілася на 32%.

К пачатку 20-х гг. XIX ст. колькасць гарадскіх жыхароў беларускіх губерняў дасягнула даваеннага ўзроўню, а к 1825 г. вырасла ў параўнанні з 1811 г. на 23%. У 1825 – 1833 гг. прырост гарадскога насельніцтва склаў толькі 1,2%, у колькасным выражэнні 1777 чалавек (з 149937 да 151714); у 16 з 42 гарадоў колькасць насельніцтва стала нават меншай. Архіўныя даныя за розныя гады другой паловы 20-х гг. XIX ст. паказваюць рост колькасці гарадскіх жыхароў Беларусі. Інакш кажучы, памяншэнне колькасці гарадскога насельніцтва праходзіла ў самым пачатку 30-х гг. XIX ст.

У пачатку 30-х гг. XIX ст. у Гродне налічвалася 10037 чалавек, у Брэсце – 8539, у Слоніме – 6134, у Пружанах – 2906. У 1833 г. колькасць насельніцтва гэтых і іншых гарадоў рэзка паменшылася (у Гродне налічвалася 4739 чалавек, Слоніме – 5182, Пружанах – 1989). Гэта скарачэнне гарадскога насельніцтва было абумоўлена памяншэннем колькасці насельніцтва Расіі, у тым ліку беларускіх губерняў, у пачатку 30-х гг. XIX ст. Вясной 1830 г. пачалася эпідэмія халеры; першыя смяротныя выпадкі былі зарэгістраваны ў маі 1830 г. у Віцебскай губерні [19], у 1831 г. эпідэмія распаўсюдзілася на Магілёўскую і Мінскую [20], а затым на Гродзенскую губерні [21]. За кароткі час памерла вялікая колькасць жыхароў Віцебска, Гарадка, Дрысы, Магілёва [22], у Мінску толькі за адзін тыдзень – з 15 па 22 красавіка 1831 г. памерлі 132 чалавекі, а ў пачатку мая – яшчэ 101. Усяго ў гарадах Мінскай губерні да 6 мая 1831 г. памерла да 1000 чалавек [23]. Колькасць гарадскога насельніцтва да 1833 г. у параўнанні з 1825 г. скарацілася ў Гродзенскай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

губерні на 2557 чалавек, у Мінскай – на 3224 чалавекі. Выбухі эпідэміі назіраліся ў 1834 – 1835 гг. [24].

Пасля 1833 г. назіраўся паступовы рост гарадскога насельніцтва. К 1842 г. колькасць насельніцтва беларускіх гарадоў павялічылася ў параўнанні з 1833 г. на 40%, у перыяд з 1842 па 1851 г. – на 14,2%, а з 1851 па 1861 г. на 31,3%, г. зн. найбольш высокія тэмпы росту гарадскога насельніцтва былі ў 1833 – 1842 гг.

Найбольшыя тэмпы росту колькасці гарадскога насельніцтва ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. назіраліся ў Гродзенскай губерні: тут яно павялічылася к 1861 г. на 575%, у астатніх губернях тэмпы росту колькасці гарадскога насельніцтва былі меншымі – у Віленскай – 355%, у Магіл1ўскай – 322%, у Мінскай – 259,5%. Самыя нізкія тэмпы росту колькасці гараджан былі ў Віцебскай губерні, насельніцтва гарадоў якой павялічылася за вывучаемы перыяд на 179,5%.

Табліца 1 – Змяненні колькасці насельніцтва гарадоў
Гродзенскай губерні у другой палове 20-х гг. XIX ст.*

| Горад | 1825 г. | 1826 г. | 1827 г. | 1828 г. | 1829 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| Брэст | 9970 | 8152 | 8043 | 8029 | 8211 |
| Ваўкавыск | 1685 | 1730 | 1742 | 1833 | 1870 |
| Гродна | 9968 | 9501 | 9861 | 10203 | 10312 |
| Кобрын | 1954 | 2891 | 2904 | 3675 | 3681 |
| Ліда | 1493 | 1723 | 1843 | 1933 | 1933 |
| Навагрудак | 1865 | 1817 | 1872 | 1897 | 2004 |
| Пружаны | 1893 | 1777 | 1779 | 1734 | 1898 |
| Слонім | 5362 | 4610 | 4741 | 4686 | 5418 |
| Усяго | 33850 | 32201 | 32785 | 33990 | 35327 |

Высокімі тэмпамі росту колькасці насельніцтва выдзяляліся Брэст (на 1112%), Ліда (на 695%), Пружаны (на 664%), Бабруйск (на 658%), Слонім (на 623%). Асноўная група гарадоў (61% ад агульнай колькасці) – гэта гарадскія паселішчы, колькасць жыхароў якіх з 1761 г. павялічылася ў 2-5 разоў. Даволі высокім працэнтам росту колькасці гараджан адрозніваліся Кобрын (на 387), Ваўкавыск (на 342), Навагрудак (на 398), Магілёў (на 392). Нязначны рост насельніцтва назіраўся ў гарадах Дрыса (на 19%), Радашковічы (на 80%), Клімавічы (на 90%), Копысь (на 93%).

Хутка расло насельніцтва гарадоў – рачных партоў , якія размяшчаліся на буйных суднаходных рэках, размешчаных на сухапутных шляхах зносін; многія з гэтых гарадоў з’уляліся развітымі гандлёвымі цэнтрамі, у якіх вёўся ажыўлены ўнутраны і вывазны гандаль. Да гэтых гарадоў адносіліся Віцебск, Полацк, Гродна, Магілёў, Мінск, Пінск, Бабруйск, Брэст, Кобрын і інш.

Значная частка гарадскога насельніцтва Беларусі ў канцы XVIII ст. (табл. 2) пражывала ў гарадах з колькасцю жыхароў да 2 тыс. чалавек (72,5% усіх гарадоў, 38% гарадскога насельніцтва), прычым у 17 гарадах (з 42) колькасць жыхароў не

* НГАБ у Гродна. – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 296. – Л. 8-109, 135; Спр. 564. – Л. 11-50; Спр. 917. – Л. 6-7; Спр. 1153. – Л. 132-133; Спр. 1161. – Л. 208; Спр. 2680. – Л. 99-100; Воп. 2. – Спр. 4. – Л. 6-41; Спр. 518. – Л. 6-37, 56 адв.; Спр. 1377. – Л. 4; Спр. 1761. – Л. 142-143.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

перавышала 1000 чалавек. Да буйных гарадоў з насельніцтвам больш за 10 тыс. чалавек адносіўся толькі Віцебск. У 30-х гг. XIX ст. такіх гарадоў было 6 (Мінск, Брэст, Віцебск, Гродна, Магілёў і Полацк) [25]. У 1861 г. буйных гарадоў налічвалася ўжо 9 (Мінск, Бабруйск, Брэст, Віцебск, Гомель, Гродна, Магілёў, Пінск і Полацк). У гэтых гарадах (21% усіх гарадскіх пасяленняў) пражывала 45,3% гараджан. Гарады з насельніцтвам менш за 2 тыс. чалавек складалі толькі 17%, у іх пражывала ўсяго 2,9% гарадскога насельніцтва. Павялічылася колькасць сярэдніх гарадоў з насельніцтвам больш за 5 тыс. чалавек (10 гарадоў, што складала 24% усіх гарадскіх пасяленняў). У гэтых гарадах пражывала 19,5% жыхароў. Такім чынам, у даследуемы перыяд вырасла колькасць буйных і сярэдніх гарадоў і значна паменшылася колькасць невялікіх гарадскіх пасяленняў з колькасцю жыхароў да 2 тыс. чалавек. Гарадоў з насельніцтвам менш за 1 тыс. чалавек у 1861 г. не было. Усё гэта сведчыць аб значных тэмпах росту гарадскога насельніцтва ў Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX ст. У 50-х гг. XIX ст. у беларускіх губернях з'явіліся гарады, насельніцтва якіх перавышала 30 тыс. чалавек (Віцебск – 30664; Магілёў – 31062). У трох гарадах (Гродна, Брэст і Мінск) насельніцтва перавышала 20 тыс. чалавек.

Табліца 2 – Змяненне колькасці дробных і
Буйных гарадоў Беларусі ў 1786 – 1861 гг.*

| Група | Колькасць жыхароў (чал.) | Колькасць гарадоў | | % | | Колькасць насельніцтва | | % | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1786 | 1861 | 1786 | 1861 | 1786 | 1861 | 1786 | 1861 |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| I | да 1000 | 17 | н.зв. | 40,0 | н.зв. | 9770 | н.зв. | 12,3 | н.зв. |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| II | 1000 – 2000 | 14 | 7 | 32,5 | 17,0 | 20345 | 9272 | 25,7 | 2,9 |
| III | 2001 – 3000 | 4 | 6 | 10,0 | 14,0 | 8682 | 14248 | 111,0 | 4,5 |
| IV | 3001 – 4000 | 2 | 5 | 5,0 | 12,0 | 7217 | 21201 | 9,1 | 6,7 |
| V | 4001 – 5000 | 1 | 5 | 2,5 | 12,0 | 4000 | 22496 | 5,1 | 7,0 |
| VI | 5001 – 6000 | 1 | 3 | 2,5 | 7,0 | 5326 | 16767 | 6,7 | 5,2 |
| VII | 6001 – 7000 | 2 | 5 | 5,0 | 12,0 | 13268 | 32053 | 16,8 | 10,0 |
| VIII | 7001 – 8000 | н.зв. | 1 | н.зв. | 2,5 | н.зв. | 7094 | н.зв. | 2,2 |
| IX | 8001 – 9000 | н.зв. | 1 | н.зв. | 2,5 | н.зв. | 8252 | н.зв. | 2,5 |
| X | звыш 10000 | 1 | 9 | 2,5 | 21,0 | 10501 | 188433 | 13,3 | 59,0 |
| | Усяго | 42 | 42 | 100 | 100,0 | 79109 | 319807 | 100,0 | 100,0 |

Тэмпы росту гарадскога насельніцтва Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. былі вышэйшыя, чым у сярэднім па Расіі і Правабярэжнай Украіне. Так, у 1825 – 1856 гг. насельніцтва гарадоў Правабярэжнай Украіны павялічылася на 76,4%, у сярэднім па Расіі – на 62% [26], а ў беларускіх губернях – больш чым на 90%. Значна вырасла ўдзельная вага гараджан у адносінах да ўсяго насельніцтва Беларусі. Так, пры агульным павелічэнні насельніцтва ў 1796 – 1836 гг. з 2635898 да 3133799 (на 18,4%) гарадское насельніцтва вырасла з 79109 да 183929 чалавек (на

* Складзена на аснове даных, што і табліца 1

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

51,4%). Удзельная вага гарадскога насельніцтва вырасла з 3,5% у 1796 г. да 10,0% у 1861 г. (табл. 3).

Табліца 3 – Удзельная вага жыхароў
па беларускіх губернях*

| Губерня | 1796 | | | 1861 | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Усяго насель-ніцтва | У гарадах | % гарад-скога на-сельніцтва | Усяго насель-ніцтва | У гарадах | % гарад-скога на-сельніцтва |
| Віленская | 137412 | 5530 | 4,0 | 410481 | 17759 | 4,3 |
| Віцебская | 317656 | 22234 | 6,9 | 347964 | 57654 | 16,6 |
| Гродзенская | 617180 | 111882 | 1,9 | 603414 | 64684 | 10,7 |
| Магілёўская | 734948 | 25297 | 3,4 | 844640 | 8885 | 10,5 |
| Мінская | 828703 | 27579 | 3,3 | 986471 | – | 9,2 |
| Усяго | 2635899 | 92522 | 3,5 | 3192970 | 319807 | 10,0 |

Самы высокі працэнт гарадскога насельніцтва як у 1796 г., так і ў 1861 г. быў у Віцебскай губерні (адпаведна 6,9 і 16,6). Больш чым у 5 разоў вырас працэнт гарадскіх жыхароў у Гродзенскай губерні (з 1,9 да 10,7). Значна павялічыўся працэнт гараджан у Мінскай губерні (з 3,3 да 9,0) і Магілёўскай губерні (з 3,4 да 10,5).

Нізкая ўдзельная вага гараджан у Віленскай губерні кваліфікуеццца тым, што працэс высялення яўрэйскай часткі насельніцтва з сельскай мясцовасці ў гарады і мястэчкі амаль не закрануў беларускія гарады гэтый губерні.

Больш высокія тэмпы росту колькасці гараджан Беларусі ў параўнанні з больш развітымі ў прамысловых адносінах цэнтральнымі губернямі Расіі, а таксама больш хуткі рост гарадскога насельніцтва ў параўнанні з сельскім тлумачыць аналіз крыніц папаўнення і росту гарадскога насельніцтва беларускіх губерняў [27].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Літаратура**

1. Маркс, К. Сочинения: в 30 т. / К. Маркс, Ф. Энгельс. – 2-е изд. – М.: Политиздат, 1961. – Т. 23. – С. 356; Ленин, В.И. Полное собрание сочинений: в 50 т. / В.И. Ленин. – 5-е изд. – М.: Политиздат, 1979-1983. – Т. 1. – С. 283, 325; Т. 2. – С. 220; Т. 3. – С. 24-25, 600.

2. Ленин, В.И. Полное собрание сочинений: в 50 т. / В.И. Ленин. – 5-е изд. – М.: Политиздат, 1979-1983. – Т. 2. – С. 220.

3. . Маркс, К. Сочинения: в 30 т. / К. Маркс, Ф. Энгельс. – 2-е изд. – М.: Политиздат, 1961. – Т. 23. – С. 646.

* Чепко В.В. Указ. твор. – С. 121; Эканамічны стан гарадскіх пасяленняў... – Т. 2. – С. 8-137; Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. – Т. 2. – С. 56-57; Перапісы насельніцтва Расіі. Вып. 5, 12; РДГА. – Фонд 1290. – Воп. 1. – Спр. 7. – Л. 2; Фонд 1374. – Воп. 1. – Спр. 120. – Л. 2; Фонд 1281. – Воп. 11. – Спр. 79. – Л. 48; Спр. 18. – Л. 123; Спр. 12. – Л. 51; Спр. 76. – Л. 21; Спр. 77. – Л. 33; Фонд 1409. – Воп. 2. – Спр. 6152. – Л. 3; Фонд 1350. – Воп. 312. – Спр. 90. – Л. 14; НГАБ. – Фонд 293. – Воп. 1. – Спр. 512. – Л. 27-30, 42-43; Спр. 361. – Л. 2, 6; Фонд 1430. – Воп. 1. – Спр. 2717. – Л. 67-68; Спр. 6756. – Л. 1842-1845, 1846; Спр. 4119. – Л. 248 адв., 309; Спр. 7966. – Л. 12; Спр. 8429. – Л. 20; Фонд 3219. – Воп. 1. – Спр. 695. – Л. 51; Спр. 65. – Л. 90-91; НГАБ у Гродна. – Фонд 1. – Воп. 4. – Спр. 655. – Л. 7-8; Воп. 2. – Спр. 583. – Л. 200 адв.

4. Ленин, В.И. Полное собрание сочинений: в 50 т. / В.И. Ленин. – 5-е изд. – М.: Политиздат, 1979-1983. – Т. 1. – С. 476.
5. Ленин, В.И. Полное собрание сочинений: в 50 т. / В.И. Ленин. – 5-е изд. – М.: Политиздат, 1979-1983. – Т. 1. – С. 25.
6. Bardach J., Leanodorski B., Pietrzak M. Op. cit. S. 264.
7. Матэрыялы па гісторыі мануфактуры на Беларусі ў часы распаду феадалізму. – Мінск, 1934. – Т. 1. – С. 6-7; Переписи населения России. Вып. 4-10; Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў у Санкт-Пецярбурзе (РДГА). – Фонд 1281. – Воп. 4. – Спр. 106. – Л. 103, 104; Фонд 1374. – Воп. 1. – Спр. 120. – Л. 2; Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Фонд 1430. – Воп. 1. – Спр. 8429. – Л. 2-39.
8. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродна ( НГАБ у Гродна). – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 296. – Л. 137-137 адв.
9. РДГА. – Фонд 1281. – Воп. 111. – Спр. 19. – Л. 54; НГАБ. – Фонд 1430. – Воп. 1. – Спр. 111111. – Л. 29-33, 46-47.
10. Глыбовский, В.И. 1812-й год в Витебской губернии. / В.И. Глыбовский. – Витебск, 1910. – С. 54; Акты, документы и материалы для политической и бытовой истории 1812 года. – СПб., 1909. – Т. 1. – С. 444.
11. Корнейчик, Е. Белорусский народ в Отечественной войне 1812 года / Е. Корнейчик. – Минск, 1962. – С. 106.
12. Семенов П.П. Указ. тв. – С. 504.
13. РДГА. – Фонд 1281. – Воп. 11. – Спр. 27. – Л. 33, 71.
14. Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы (ДГА Літвы). – Фонд 378. – Воп. 21. – Спр. 77. – Л. 16-56.
15. ДГА Літвы. – Фонд 378. – Воп. 21. – Спр. 77. – Л. 18 адв.
16. ДГА Літвы. – Фонд 378. – Воп. 21. – Спр. 77. – Л. 47 адв.
17. НГАБ у Гродна. – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 296. – Л. 8-105.
18. НГАБ. – Фонд 2001. – Воп. 1. – Спр. 128. – Л. 17.
19. НГАБ. – Фонд 1430. – Воп. 1. – Спр. 3055. – Л. 139-140.
20. НГАБ. – Фонд 1430. – Воп. 1. – Спр. 2671. – Т. 2. – Л. 376 адв.
21. РДГА. – Фонд 1281. – Воп. 3. – Спр. 40. – Л. 4 адв.
22. НГАБ. – Фонд 1430. – Воп. 1. – Спр. 3055. – Т. 1. – Л. 145-148.
23. НГАБ. – Фонд 1430. – Воп. 1. – Спр. 3055. – Т. 1. – Л. 28.
24. РДГА. – Фонд 1281. – Воп. 3. – Спр. 40. – Л. 17; НГАБ. – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 652. – Л. 20.
25. Рашин, А.Г. Население России за 100 лет / А.Г. Рашин. – М., 1956.
26. Болбас, М.Ф. Аб шляхах зносін, гандлі і гарадах дарэформеннай Беларусі і іх уплыве на развіццё прамысловасці / М.Ф. Болбас // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1961. – № 1. – С. 59.
27. Гл.: Источники пополнения и роста городского населения в конце XVIII – 30-е годы XIX в. // Вопросы истории. – Минск, 1981.

**Ключевые слова: Рост насельніцтва, гарады, сацыяльны склад насельнітва**

Лютая, А. Э. Колькасны рост насельніцтва гарадоў Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX ст. / А. Э. Лютая, А. М. Люты // // Европа: актуальные

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

проблемы этнокультуры : сб. науч. ст. / Белорус. гос. пед. ун-т ; редкол. : В. В. Тугай (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2008.– С. 221–225.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ